# Да Марка Шагала ў Віцебск

Лістапад – гэта той месяц, які выкладчыкі, студэнты, магістранты і аспіранты кафедры культуралогіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў чакаюць з нецярпеннем. І не дзіўна, бо кожны год кафедра ладзіць цікавыя краязнаўчыя экспедыцыі па гістарычных мясцінах Беларусі. У гэты раз быў абраны Віцебск.

Студэнты першых курсаў па даручэнні загадчыка кафедры, доктара культуралогіі, прафесара Аляксандра Смоліка падрыхтавалі паведамленні пра гісторыю Віцебска, яго сучаснае жыццё, знакамітых людзей, чый лёс быў звязаны з горадам. Ужо едучы ў аўтобусе, амаль за чатыры гадзіны мы даведаліся пра царкву Дабравешчання Найсвяцейшай Багародзіцы, Свята-Духаў жаночы манастыр, царкву Аляксандра Неўскага, Музей гісторыі віцебскага трамвая, культурна-гістарычны комплекс «Залатое кальцо Віцебска "Дзвіна"»... Не кажучы ўжо пра «Славянскі базар», музычны фестываль імя І.І. Салерцінскага, фестываль сучаснай харэаграфіі і нашумелы еўрапейскі праект «Узмацненне магчымасцяў турыстычнага развіцця ў трансмежным рэгіёне Латгале – Утэна – Віцебск» праграмы трансмежнага супрацоўніцтва «Латвія – Літва – Беларусь».

Будучыя культуролагі з натхненнем расказвалі пра творчасць Юдэля Пэна, Казіміра Малевіча, Эля Ліціцкага і, безумоўна, Марка Шагала. Постаць гэтага чалавека стала своеасаблівым лейтматывам усёй нашай праграмы, бо, у першую чаргу, ехалі менавіта да Яго – да Марка Шагала.

Ён нарадзіўся непадалёк Віцебска, а праз некаторы час з бацькамі пераехаў у горад. Спачатку ў іх была адна драўляная хата на вуліцы Пакроўскай, пазней бацькі пабудавалі яшчэ дзве драўляныя і адну цагляную хаты. У апошняй цяпер месціцца Дом-музей мастака. Дарэчы, пры стварэнні яго экспазіцыі былі выкарыстаныя замалёўкі, якія Шагал зрабіў у 1911 годзе перад ад'ездам у Парыж. Цяпер яны захоўваюцца ў Цэнтры Жоржа Пампіду.

Парыж... Гэты горад, у які мастака занесла жыццё і які ён называў «другім Віцебскам», моцна паўплываў на станаўленне Шагала як аднаго з найцікавейшых мастакоў XX стагоддзя, аўтара раскошных мадэрнісцкіх палотнаў «Адам і Ева», «Від Парыжа з акна», «Палова трэцяга, ці Паэт» і іншых. Аднак родны горад, які ён так любіў, заўсёды прысутнічаў на яго карцінах. Напрыклад, карціна «Аўтапартрэт з сямю пальцамі» з выявамі на ім Парыжа і Віцебска. У паэтычным звароце «Да майго горада Віцебска», апублікаваным у 1944 годзе ў Нью-Ёркскім часопісе «Адзінства», ён пісаў: *«Як сумны вандроўца – я толькі нёс усе гады тваё дыханне на маіх карцінах. І так з табой гутарыў і, як у сне, цябе бачыў. Я цябе цалаваў усімі фарбамі і штрыхамі...»*.

Напрыканцы 1917 года Шагал разам з сям'ёй вяртаецца ў Віцебск. Мастак зноў займаецца творчасцю, піша знакамітыя палотны «Над горадам», «Прагулка». Праз некаторы час ён атрымлівае пасаду ўпаўнаважанага калегіі па справах мастацтваў Камісарыята народнай асветы па Віцебскай губерні, тым самым атрымлівае магчымасць ствараць мастацкія школы, музеі, арганізоўваць выстаўкі і інш. У першую чаргу мастак заняўся мастацкім афармленнем горада да першай гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі.



Фота Алены СПІРЫНАЙ

Як піша Людміла Хмяльніцкая ў кнізе «Марк Шагал і Віцебск»: *«За адну ноч вуліцы Віцебска запоўнілі не толькі кумачовыя транспаранты, але і малюнкі жывёлаў, што ляцяць у паветры, у ненатуральнай для іх афарбоўцы»*.

У студзені 1919 года была адкрытая Народная мастацкая вучэльня, у якой працавалі выбітныя мастакі, якіх запрасіў Шагал: Эль Ліціцкі, Ксенія Багуслаўская, Надзея Любавіна, Казімір Малевіч, Вера Ермалаева і іншыя.

Першым дырэктарам вучэльні стаў знакаміты мастак Мсціслаў Дабужынскі, пасля яго ўстанову ўзначаліў сам Шагал.

З-за цяжкага палітычнага становішча (акупацыя тэрыторыі Беларусі Польшчай, грамадзянская вайна) культура ўсё больш адсоўваецца на другі план. Для творцы пачынаецца цяжкі этап. Такіх этапаў у Шагала было шмат. Талент, крэатыў і жаданне палепшыць жыццё сваё і людзей, на жаль, часта сутыкаюцца з несправядлівасцю. Так сталася, што імя вялікага мастака-наватара было забытае на яго радзіме, і толькі ў канцы XX стагоддзя пачалася праца па яго адраджэнні і вяртанні.

У 1990-х гадах быў створаны Музей Марка Шагала, які месціцца ў двух будынках: Арт-цэнтр (вуліца Путна, 2) і мемарыяльны Дом-музей Шагала (вуліца Пакроўская, 11). У фондах музея знаходзіцца каля 300 графічных прац мастака (літаграфіі, ксілаграфіі, афорты, акварэлі), у тым ліку серыя ілюстрацый да паэмы М. Гогаля «Мёртвыя душы», каляровыя літаграфіі з серыяў «Біблія» і інш. Калегі з Германіі перадалі музею шмат графічных прац і кніг. Цяпер бібліятэка змяшчае багатыя зборы пра мастакоў класічнага авангарда.

Таксама ўсталяваны помнік Шагалу (скульптар А. Гвоздзікаў) і скульптурная кампазіцыя «Віцебская мелодыя на французскай скрыпцы» (скульптар У. Магутны). Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Якуба Коласа паставіў спектакль па п'есе У. Драздова «Шагал, Шагал», які быў паказаны на шматлікіх тэатральных сцэнах свету.

Дзякуючы добрым стасункам з унукамі Шагала Мерэт Мэйер-Грабер і Бэлай Мэйер было праведзена некалькі выставак гравюраў і акварэляў са збораў сям'і. У 2012 годзе ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь адбылася выстаўка «Марк Шагал. Жыццё і каханне», якая стала адным з найбольш яскравых мерапрыемстваў мастацкага жыцця краіны.

Кожны год у Віцебску праводзяцца Міжнародныя Шагалаўскія дні, у межах якіх ладзяцца навуковая канферэнцыя «Міжнародныя Шагалаўскія чытанні», пленэры, выстаўкі, музычны фестываль «Скрыпка Шагала», свята «У гасцях у Марка і Бэлы» і іншыя імпрэзы, на якія збіраюцца ўдзельнікі з Беларусі, Расіі, Украіны, Францыі, Вялікабрытаніі, Германіі, Швейцарыі, ЗША, Ізраіля і іншых краінаў свету.

Таксама пры музеі працуе Міжнародная летняя школа мастацтваў, асноўная мэта якой – развіццё творчага мыслення моладзі на скрыжаванні розных відаў мастацтваў.

Некалькі гадоў таму ў Віцебску быў створаны Міжнародны фонд «Залатая спадчына Віцебска», які займаецца адраджэннем гістарычнай часткі горада, дзе, дарэчы, і знаходзіцца мемарыяльны Дом-музей мастака.

Думаецца, што цікавасць да постаці Шагала і яго культурнай спадчыны будзе толькі расці. Яго фантастычныя сюжэты і вобразы, адлюстраваныя на палотнах, – захапляюць і ўражваюць. А імя вялікага майстра, які пражыў 98 гадоў і здзейсніў сапраўдную рэвалюцыю ў мастацтве, на стагоддзі застанецца ў гісторыі сусветнай культуры.

*Павел САПОЦЬКА*